УДАКЛАДНЕНЫ ПЕРАЛІК АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭДУР ПРЫ НАЗНАЧЭННІ АСОБНЫХ ВІДАЎ ДАПАМОГ

Як паведамілі БелТА ў прэс-службе Прэзідэнта, Аляксандр Лукашэнка 5 жніўня падпісаў адпаведны ўказ № 342, якім унесены дапаўненні і змяненні ва ўказ ад 26 красавіка 2010 года № 200 «Аб адміністрацыйных працэдурах, якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян».

Зыходзячы з палажэнняў закона ва ўказе ўдакладнены найменні некаторых адміністрацыйных працэдур для назначэння дзяржаўных дапамог сем'ям, што выхоўваюць дзяцей, арганізацыі, у якія павінен звярнуцца грамадзянін за назначэннем названых дапамог, пералік дакументаў, прадастаўленне якіх неабходна для назначэння дапамог, а таксама тэрміны назначэння некаторых відаў дзяржаўных дапамог сем'ям, што выхоўваюць дзяцей.

У прыватнасці, прадугледжана, што назначэнне і выплата дапамог па цяжарнасці і родах, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, на дзяцей старэйшых за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў будзе ажыццяўляцца не толькі па месцы работы, вучобы, у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, але і па месцы праходжання грамадзянамі падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры. Пры гэтым за назначэннем і выплатай дапамог па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці грамадзяне, якія стаяць на ўліку ў органах Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Мінпрацы і сацабароны ў якасці плацельшчыкаў абавязковых узносаў, павінны будуць звяртацца ў органы фонду.

Доля назначэння дапамогі па цяжарнасці і родах жанчыне (нараўне з дакументамі, якія прадстаўляюцца цяпер) неабходна будзе прадставіць даведку аб памеры заработнай платы, калі на працягу 6 месяцаў, што папярэднічалі месяцу, у якім у яе ўзнікла права на дапамогу, яна працавала ў розных наймальнікаў. Гэта патрабуецца ў сувязі з тым, што ў заработак для вылічэння названай дапамогі ўключаюцца не ўсе выплаты, на якія налічваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы, і ён не можа быць пацверджаны звесткамі індывідуальнага (персаніфікаванага) уліку, якія маюць у распараджэнні органы фонду. Акрамя таго, для назначэння асобных відаў дапамог грамадзяне павінны будуць прадстаўляць некаторыя дакументы, якія ёсць у іх асабіста (напрыклад, пасведчанне аб заключэнні шлюбу для мачыхі (айчыма) дзіцяці, копія рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа аб устанаўленні апекі (папячыцельства) для асоб, назначаных апекунамі (папячыцелямі).

У выпадку неабходнасці накіравання запыту дакументаў і (або) звестак ад іншых дзяржаўных органаў, іншых арганізацый і (або) атрымання дадатковай інфармацыі для назначэння, напрыклад, дапамог па цяжарнасці і родах, па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці тэрмін назначэння такіх дапамог складзе 1 месяц. Пры адсутнасці неабходнасці накіравання такога запыту тэрмін назначэння названых дапамог, як і раней, складзе 10 дзён з дня звароту грамадзяніна.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

ПРЫЗНАННЕ ТАЛЕНТУ

У Мінску ўручылі дыпломы беларускім намінантам на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва

Імі сталі народны мастак Беларусі, скульптар Іван Міско за серыю твораў манументальнага мастацтва, народны мастак Беларусі Гаўрыла Вашчанка за цыкл жывапісных твораў і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора імя Цітовіча Міхаіл Дрынеўскі за канцэртныя праграмы, выкананыя ў Беларусі і Расіі.

Усяго на ўдзел у змаганні за прэмію Саюзнай дзяржавы ад Беларусі было пададзена больш за 10 заявак. Але на калегіі Міністэрства культуры было вырашана, што толькі тры з'яўляюцца найбольш вартымі.

— Трэба ўлічваць, што крытэрыі адбору для ўдзелу вельмі жорсткія, — адзначае **першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ.** — Справа ў тым, што некаторыя прадстаўленыя для разгляду заяўкі альбо былі афармлены не ў адпаведнасці з патрабаваннямі, альбо, напрыклад, мелі састарэлыя звесткі. Такія заяўкі, вядома, прымаць мы не маглі. Кандыдатамі, вылучанымі ад нашай краіны, мы вельмі ганарымся і спадзяёмся, што іх творчыя дасягненні не застануцца незаўважанымі.

Цікава, што ад расійскага боку ў змаганні за прэмію бяруць удзел 8 намінантаў. Таму, здавалася б, цалкам дарэчным было ўзгадаць пра колькасць ды якасць. Але прэміі, конкурсы і фестывалі з'явы такія неадназначныя. Ніколі не ведаеш, чаму ў спісе ўдзельнікаў аказалася тое ці іншае прозвішча. У любым выпадку ўсе беларускія намінанты людзі вядомыя, з рэпутацыяй і відавочнымі дасягненнямі.

Ппрэмія Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва прысуджаецца за творы мастацтва, якія зрабілі вялікі ўнёсак ва ўмацаванне стасункаў братэрства, сяброўства і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі — удзельніцамі Саюзнай дзяржавы. Выглядае вельмі лагічным, што з беларускага боку намінантамі на прэмію сталі людзі сталага пакалення,з вялікім жыццёвым вопытам. Для іх, як для нікога, творчыя стасункі з братнім народам з'яўляюцца сапраўды вельмі важнымі.

— Музыка адлюстроўвае жыццё людзей. Я з задавальненнем бяруся за народныя песні, таму што ў іх гучыць сэнс, гісторыя народа, чалавечыя перажыванні. Музыку трэба разумець, каб па-сапраўднаму любіць, — перакананы **мастацкі кіраўнік народнага хора імя Цітовіча Міхаіл ДРЫНЕЎСКІ.** — Расія — гэта нашы браты і сёстры, таму ў нашым рэпертуары шмат рускіх народных песень, якія вельмі любяць беларусы. Намінацыя на прэмію — гэта вынік зробленага хорам за 60 гадоў існавання. Я ў ім адпрацаваў таксама нямала — 45 гадоў. Таму гэта вельмі прыемна і шаноўна.

З расійскага боку на прэмію намінаваны, напрыклад, пісьменнік Барыс Косцін, аўтар гісторыка-дакументальных кніг пра С. Полацкага, Рагнеду і Уладіміра. Адна з яго кніг выдадзена ў Мінску А таксама вядомыя ў Беларусі мастацкія дзеячы, народныя артысты СССР Уладзімір Зельдзін і Юрый Башмет, кампазітары Уладзімір Бяляеў і Сяргей Цярханаў, паэты Уладзіслаў Арцёмаў і Мікалай Трацькоў. Упершыню ў гісторыі прэміі сярод намінантаў аказалася мастацтвазнаўца. Ёй стала гісторык архітэктуры Інеса Слюнькова (артыкул пра яе — у сённяшнім нумары «Звязды») за серыю даследаванняў праваслаўнай архітэктуры Беларусі. Ад Расіі таксама намінаваны калектыў мастакоў таварыства «Паўлапасадская хустачная мануфактура».

Фота Надзеі БУЖАН.

— Стасункі паміж Расіяй і Беларуссю як былі, так і будуць умацавацца, — упэўнена заяўляе Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ. — Беларускія дзеячы мастацтва як рабілі, так і будуць рабіць вялікія ўнёскі ў развіццё культуры Расіі, і наадварот. Узгадайма хаця б Уладзіміра Мулявіна, які быў рускім, ансамбль «Харошкі», у якога мастацкі кіраўнік з Расіі, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі Аляксандра Анісімава...

Раней лаўрэатамі прэміі ад Беларусі станавіліся драматург Аляксей Дударэў, пісьменнік Іван Шамякін, мастакі Міхаіл Савіцкі, Леанід Шчамялёў, Георгій Паплаўскі, акцёр Расціслаў Янкоўскі, дырыжор Міхаіл Фінберг.

Нагадаем, што прэмія Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва ўручаецца раз у два гады з 2002 года. Сёлета ў верасні адбудзецца пасяджэнне рады Саюзнай дзяржавы, на якім вызначаць, хто будзе вылучаны на званне лаўрэата (усяго іх будзе тры). Імёны пераможцаў арганізатары назавуць напрыканцы года. А ўрачыстае ўзнагароджанне адбудзецца, па традыцыі, падчас «Славянскага базару ў Віцебску» ў наступным годзе.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

СТРУКТУРА НАВУКОВАЙ СФЕРЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Пытанне яшчэ ў тым, калі гэта не трэба краіне і перспектывы не відаць, але вы бачыце, што гэта заўтра можна прадаць, — калі ласка, займайцеся. Дамаўляйцеся з Кітаем, Расіяй, Амерыкай — кім заўгодна. Няхай яны фінансуюць вас — а яны з задавальненнем будуць фінансаваць, калі ўбачаць, што заўтра будзе нармальны прадукт», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прагматычным павінен стаць падыход і да ўдзелу беларускіх вучоных у такіх буйных міжнародных праектах, як вывучэнне касмічнай прасторы, работа Вялікага адроннага калайдара. Такія праекты закліканы не толькі задавальняць навуковую цікавасць, але і станавіцца стымулам для развіцця ў Беларусі высокатэхналагічных вытворчасцяў. «Але ў гэтым мы павінны прымаць удзел толькі на аснове глыбокага прагматызму», — дадаў Прэзідэнт.

«Плаціць шалёных грошай мы з 1 студзеня нікому не будзем, у тым ліку і вучоным. І вучоным, перш за ўсё, таму што яны — разумныя людзі, павінны зарабіць і сабе, і дзяржаве».

Прэзідэнт лічыць, што вынікі навуковых даследаванняў як у галіне натуральных, так і гуманітарных навук неабходна ператварыць у запатрабаваны эканомікай і грамадствам інтэлектуальны прадукт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўны ўпор павінен быць зроблены на прыкладныя распрацоўкі. На яго думку, для гэтага патрабуецца ўдасканаленне існуючай сістэмы праграмна-мэтавага кіравання навукай.

«Работа па прамых заказах вытворчага сектара павінна стаць распаўсюджанай практыкай», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — У сучасных умовах важна не столькі размеркаваць і асвоіць бюджэт на навуку, колькі стварыць на аснове яе вынікаў высокатэхналагічны і інавацыйны прадукт. Патрэбна эфектыўная сістэма навуковага менеджменту».

Аляксандр Лукашэнка даў тры месяцы на распрацоўку праграмы рэфармавання беларускай навукі. «У лістападзе мы запросім шырокае кола навуковай супольнасці і, прынцыповым чынам разабраўшыся, зацвердзім новую праграму дзейнасці навукі ў цэлым», — сказаў Прэзідэнт.

СТАЎКІ РУБЛЁВЫХ УКЛАДАЎ ПАКУЛЬ ЗАХАВАЮЦЦА НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля гэтага Нацыянальны банк падтрымаў ліквіднасць банкаў значнай сумай, прадаставіўшы ім рублёвыя рэсурсы пад 40% гадавых. Гэта пацягнула за сабой рэзкае зніжэнне (да 15 працэнтных пунктаў) ставак аднадзённых міжбанкаўскіх крэдытаў у нацыянальнай валюце.

Разважаючы аб тым, чаго ў бліжэйшай будучыні трэба чакаць ад узляцеўшых ставак па рублёвых дэпазітах, старшыня праўлення Мінскага транзітнага банка Андрэй Жышкевіч звяртае ўвагу на тое, што вельмі шмат тут зноў жа будзе залежаць ад Нацыянальнага банка. Калі рэгулятар працягне аказваць шырокую падтрымку банкам, даючы ім рублёвыя сродкі пад 40% гадавых, то стаўкі дэпазітаў у нацыянальнай валюце, хутчэй за ўсё, больш расці не будуць, лічыць эксперт. «Разам з тым, некаторую колькасць месяцаў мы будзем жыць ва ўмовах ставак на рублёвыя ўклады, якія павысіліся», — прагназуе ён.

На думку Андрэя Жышкевіча, на працягу гэтага перыяду стаўкі дэпазітаў у нацыянальнай валюце могуць заставацца на ўзроўні 35—40% гадавых. Сёння гэта якраз сярэднярыначны ўзровень, характэрны для асноўных гульцоў рынку. Стаўкі крыху вышэйшыя, якія даходзяць да 40—45% гадавых, як правіла, прапаноўваюць банкі, якія адчуваюць параўнальна большую патрэбнасць у ліквіднасці, канстатуе ён. Аднак гэтыя банкі невялікія па памеры і здольныя задаволіць сваю кароткатэрміновую патрэбнасць у рублях дастаткова невялікай сумай, пасля чаго можна чакаць, што і яны знізяць стаўкі па рублёвых укладах да ўзроўню сярэдніх 35—40%. Разам з тым, многае будзе залежаць ад рэакцыі ўкладчыкаў, якія будуць «галасаваць рублём» за сімпатычны ім узровень ставак, адзначае эксперт.

А вось перспектыва для паклоннікаў валютных дэпазітаў, на думку аналітыкаў, выглядае не так прывабна. «Варта адназначна чакаць зніжэння даходнасці па валютных дэпазітах», — прагназуе эксперт афіцыйнага партнёра кампаніі TeleTrade ў Беларусі Мікалай Ільін.

Пры гэтым стаўкі па крэдытах у замежнай валюце вырастуць, адзначаюць эксперты. Дынаміка ў гэтай сферы звязана з тым, што з 1 жніўня Нацыянальны банк Беларусі павысіў для банкаў норму абавязковага рэзервавання ад валютных прыцягнутых сродкаў на 2 працэнтныя пункты — з 12% да 14%. Акрамя таго, з 1 кастрычніка для банкаў павышаецца каэфіцыент рызыкі, які прымяняецца да валютных крэдытаў, — са 100% да 150%. «Нацыянальны банк рэальна зрабіў больш жорсткімі для банкаў умовы валютнага крэдытавання, і банкі непазбежна будуць рэагаваць на такія дзеянні рэгулятара павышэннем ставак. Гэта будзе не імгненна, але адбывацца», — канстатуе Андрэй Жышкевіч.

Што датычыцца крэдытаў у нацыянальнай валюце, то эксперты прагназуюць, што іх кошт будзе блізкім да ставак рублёвых дэпазітаў, паўтараючы з пэўным часовым лагам дынаміку іх росту.

Галоўны рэдактар інфармацыйнага агенцтва Святлана ШУТАВА:

■ Медыяперсона

«ПЕРШЫ БЛІН НЕ КАМЯКОМ, КАЛІ ЁСЦЬ ПРЫБЫТАК»

У Магілёве адбыліся змены ў медыйнай прасторы. Новае выдавецкае прадпрыемства аб'яднала абласную грамадска-палітычную газету «Магілёўскія ведамасці», два штотыднёвікі — «Магілёўская праўда» і «Дняпроўскі тыдзень», а таксама Дом друку ў абласным цэнтры. Усё разам гэта цяпер называецца інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці». Галоўны рэдактар Святлана Шутава расказала карэспандэнту «Звязды» пра першыя крокі, новыя ідэі і планы на перспектыву.

— Чыя ідэя стварыць новае прадпрыемства, аб'яднаць абласныя газеты?

— Ідэя наша і нашага заснавальніка, Магілёўскага аблвыканкама. Але тут не толькі аб'яднаны «пад адным дахам» тры магілёўскія газеты, але і створаны асобны праект — сайт mogilevnews.by.

— З якой мэтай адбылося аб'яднанне?

— Сёння не сакрэт, што выжываць лепш разам. Таму найперш аб'яднанне зроблена для паляпшэння фінансава-эканамічнага стану рэдакцый. Вядома, газеты выходзяць у свет, як і раней. Але цяпер у нас адзіныя бухгалтэрыя і рэкламная служба, якія працуюць на ўсе выданні. Газеты і сайт узначальваюць свае рэдактары, але журналісты працуюць на ўсе «франты», і гэта таксама эканомія творчых сіл. Нам хочацца, каб у новым прадпрыемстве стала лепш і ў фінансавым, і ў творчым плане.

— Новае прадпрыемства існуе толькі некалькі месяцаў. І ўжо, напэўна, можна спытацца: як пайшло? І ці было страшна?

— Невядомасць заўсёды пужае. Людзям было псіхалагічна складана. Па вялікім рахунку, мы не ведалі, што гэта і як... Ва ўсякім разе, у Магілёўскай вобласці такога вопыту аб'яднання газет у адно прадпрыемства не было. Дапамагла паездка ў «Мінск—Навіны». Мы паглядзелі, што гэта можна (і трэба) рабіць і ў абласцях.

Ну і «першы блін» усё ж такі не аказаўся камяком. Таму што спрацавалі з прыбыткам. Невялікім, але ўсё ж такі прыбыткам. Мы захавалі калектыў: пайшлі пасля аб'яднання толькі некалькі чалавек, і яны ў сувязі са скарачэннем атрымалі грашовыя кампенсацыі. Наш штат налічвае 65 чалавек. У рэдакцыі «Магілёўскіх ведамасцяў» было прыкладна ўдвая менш. Цяпер трэба спакойна працаваць, і гэта самае галоўнае.

— Ці не дзіва, што газета, якая нарадзілася ў часе постсавецкай перабудовы, пераўтварылася ў буйное інфармацыйнае агенцтва, ды з далучэннем старэйшай газеты вобласці?

— Наадварот, тут усё лагічна. «Магілёўскія ведамасці» калісьці сказалі новае слова ў журналістыцы. У іх быў шалёны тыраж — сто тысяч асобнікаў. За тым часам пра такі можна было толькі марыць, а сёння ён увогуле падаецца неверагодным, недасягальным.

Дарэчы, наш тыраж пасля аб'яднання не паменшыўся. Тут мы павінны падзякаваць нашаму заснавальніку за падтрымку. І «Магілёўскія ведамасці», і «Магілёўская праўда» паказалі добрыя вынікі ў «летняй» падпісцы. Мы задаволены.

— Але ваш галоўны праект — гэта ўсё ж такі сайт?

— На яго развіццё робім асноўны націск. Гэта наша будучыня. Трэба ўлічваць сітуацыю: газеты, вядома, застануцца, але ўсе сёння ў інтэрнэце. Нам выпадае нарошчваць там сваю прысутнасць.

Святлана ШУТАВА і рэдактар газеты «Магілёўскія ведамасці» Яўген БУЛАВА.

— А ці можна на гэтым зарабіць?

— Мяркую, што з цягам часу — так, можна. Мне б не хацелася раскрываць тут усе нюансы. Але грошы павінны быць, хоць і не адразу. Мы ставім перад сабой задачу стаць галоўнай крыніцай навін на Магілёўшчыне. Арыентуемся толькі на рэгіянальныя навіны, і каб інфармацыя на сайце абнаўлялася штогадзіну. Каб навіны з'яўляліся нават у непрацоўны час і выхадныя дні. Пакуль для напаўнення сайта мы выкарыстоўваем навіны з іншых СМІ, супрацоўнічаем з калегамі, у нас працуюць прафесійныя журналісты, якія імкнуцца выдаваць эксклюзіўную інфармацыю. Але я і цяпер задаволена: нас добра цытуюць.

— Ці вялікая розніца паміж тым, што пішуць вашы газеты і на сайце?

— Безумоўна, стыль газет і інфармацыйнага сайта адрозніваецца. Газеты цягнуцца да вялікіх формаў. На сайце ж можна знайсці толькі інфармацыю — дзе, што і калі адбылося ў вобласці. І мы наўмысна адключылі функцыю каментарыяў чытачоў. Наша задача — інфармаваць, а абмеркаваць гэта можна на сайтах нашых газет, у сацыяльных сетках.

Журналістам спачатку было складана прызвычаіцца да новых «правілаў гульні» на сайтах. Перапісвалі, пераробліваліі. Але цяпер, пасля некалькі месяцаў, у нас знайшліся людзі, якія па чарзе рэдагуюць інфармацыю для сайта. Гэта маладыя людзі — больш сталыя журналісты аддаюць перавагу газетам.

— Якія змены адбыліся ў газетах?

— Мы настроены захаваць усе тры газеты. Цяпер толькі прыбралі некалькі палос у «Магілёўскай праўдзе», каб не друкаваць вялікую тэлепраграму. Тэлепраграма — гэта раскоша ў плане газетнай паперы, і мне падаецца, што яна страціла ўжо сваю вялікую актуальнасць. Людзі карыстаюцца цяпер тэлетэкстамі на сучасных тэлевізарах, глядзяць анонсы і гэтак далей.

Увогуле, захаваць высокі ўзровень старэйшай газеты ў вобласці «Магілёўская праўда» — гэта для нас прынцыпова. «Магілёўскія ведамасці» былі і застаюцца афіцыйным органам Магілёўскага аблвыканкама.

— Што трэба, каб газета добра прадавалася?

— Гэта проста: каб яна была цікавай.

— Як вы думаеце, людзі будуць у бліжэйшай будучыні чытаць газеты або ўсё ж такі давядзецца ўсім нам рухаць у прастору інтэрнэту?

— Натуральна, што новыя формы трэба рухаць, каб не выглядаць у сучасным свеце «белай варонай», ісці ў нагу з часам. Але не забывацца на газеты. Трэба, каб народ чытаў. Цяпер усе скардзяцца, што маладыя людзі бездухоўныя: нічога не чытаюць, нават і тэлевізар ужо не глядзяць, сядзяць у інтэрнэце...

— Наўрад ці варта вучыцца духоўнасці па перыядычных выданнях.

— Але яны інфармуюць і падштурхоўваюць да развіцця. У артыкулах закранаюцца тэмы, якія прымушаюць задумацца над з'явамі жыцця, над праблемамі людзей.

— Мне падаецца, што ўзяць газету ў рукі — у гэтым ёсць нешта... і вельмі прыемнае.

— Інтэрнэт добры для інфармацыі. Аднак я і сваім дзецям настойліва раю цікавіцца навінамі, глядзець добрае кіно, чытаць. Трэба не прымушаць, але падказваць і зацікаўліваць газетамі: калі ты хочаш быць пісьменным і інтэлігентным чалавекам — трэба чытаць, хаця б газеты.

Паглядзіце на Захад, якія напярэдзе нас у інтэрнэт-справах. Мы толькі робім першыя крокі ў гэтым кірунку і вучымся. Але там усё роўна газеты прадаюцца, людзі чытаюць. Мне падаецца, што ў нас быў такі перыяд, калі народ увогуле нічога не выпісваў, нават страшна было. Цяпер, падаецца, справы наладжваюцца. І няхай скардзяцца часам на адміністрацыйны рэсурс, але ўсё ж відавочна адно: газеты дрэннаму не навучаць.

— Пакуль ідзе наша інтэрв'ю, у кабінет галоўнага рэдактара з паперамі заходзяць людзі. Я звярнула ўвагу, што ўсё гэта жанчыны. Ці не азначае гэта, што журналістыка становіцца жаночай справай?

— У нас тут не жаночае царства, ёсць і мужчыны. Але так, шмат прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва. І калі прыходзіць моладзь на практыку з універсітэта, то ў асноўным гэта дзяўчаты.

— Чаму ж так?

— Таму што нашай прафесіяй сям'ю цяжка пракарміць. Мужчыны ідуць у тыя сферы, дзе можна добра зарабіць. Трэба нам плаціць больш. Таму цяпер асноўная задача, над якой мы тут працуем, — гэта павелічэнне заробку. Гэта ў планах. Сёння супрацоўнікі інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» зарабляюць, скажам, у сярэднім па галіне. Мне б хацелася, каб у нас журналістам было прэстыжна працаваць. Каб сюды стаяла чарга тых, хто хоча добра працаваць і атрымліваць за гэта дастойны заробак.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.
Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПАДАТАК ЗА ЗДАЧУ ЖЫЛЛЯ НАЛЕТА ПАВЯЛІЧАЦЬ НА 10%?

Міністэрства фінансаў падрыхтавала праект змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Беларусі. Згодна з гэтым дакументам, у 2014 годзе плануецца павялічыць стаўкі падаходнага падатку з фізічных асоб за здачу ўнаём жылля, гаражоў і іншых памяшканняў.

Плануецца, што такія стаўкі могуць быць павялічаны прыкладна на 10 працэнтаў. Нагадаю, што ў Мінску мінімальны памер такога падаходнага падатку за кожны здымны пакой у жылым памяшканні складае 95 тысяч рублёў за месяц. У наступным годзе падобны падаходны падатак плануюць павялічыць да 105 тысяч рублёў. Максімальны памер падатку за здымны пакой можа павялічыцца з 365 да 405 тысяч рублёў. Аналітыкі рынку жыллёвай арэнды адзначаюць, што сваім рашэннем Мінфін толькі ініцыіруе індэксацыю ставак падаходнага падатку ў адпаведнасці з чакаемым узроўнем інфляцыі.

Сяргей ПАЛІНІН.

НА ДЭФЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ БЕЛАРУСЫ ЗАВАЯВАЛІ РЭКОРДНУЮ КОЛЬКАСЦЬ УЗНАГАРОД

Заваяваўшы 27 узнагарод рознай вартасці на XXII летніх Дэфлімпійскіх гульнях (для людзей з парушэннямі слыху), якія завяршыліся ў балгарскай сталіцы, Сафіі, 4 жніўня, беларускія спартсмены паказалі рэкорднае дасягненне на спаборніцтвах такога рангу. Зборная Беларусі ў медальным заліку заняла 4-е месца, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Беларускімі дэфлімпійцамі заваявана 12 залатых, 11 сярэбраных і 4 бронзавыя ўзнагароды.

Чэмпіёнамі ў Сафіі сталі выключна прадстаўнікі лёгкай атлетыкі і плавання.

На Дэфлімпійскіх гульнях 2013 года ў Сафіі спаборнічалі 48 беларускіх атлетаў. Гэтая колькасць удзельнікаў стала рэкордная ў складзе каманды, роўна як і колькасць заваяваных імі ўзнагарод.

Першая дзясятка краін у медальным заліку Дэфлімпійскіх гульняў у Сафіі выглядае так:

1. Расія (67, 52, 58)
2. Украіна (21, 30, 37)
3. Рэспубліка Карэя (19, 11, 12)
4. Беларусь (12, 11, 4)
5. Кітай (12, 5, 8)
6. ЗША (9, 8,12)
7. Турцыя (7, 9, 17)
8. Іран (7, 4, 21)
9. Кенія (6, 5, 5)
10. Літва (4, 5, 4).

SOFIA 2013 22nd SUMMER DEAFLYMPICS

УНІВЕРСАЛЬНЫЯ РАБОЧЫЯ З'ЯВЯЦЦА ВА ЎСІХ МІНСКІХ ЖЭСАХ

Спецыялістаў вузкага профілю ў мінскіх ЖЭСах заменяць універсальныя рабочыя. Аб гэтым паведаміў на аператыўнай нарадзе ў мэрыі генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Хадарцэвіч, перадае карэспандэнт БелТА.

Эксперыментальны праект стартаваў ужо ў трох ЖЭСах (№ 32, №13, № 28) і добра сябе зарэкамендаваў, цяпер вопыт пераймаюць іншыя арганізацыі. Для работнікаў жыллёва-камунальных службаў арганізаваны спецыяльныя курсы, якія прадугледжваюць месяц тэарэтычнай і два месяцы практычнай падрыхтоўкі.

Рабочыя па комплексным утрыманні і рамонце будынкаў і збудаванняў будуць абслугоўваць каля 500 асабовых рахункаў, у іх функцыянальныя абавязкі будзе ўваходзіць выкананне сантэхнічных, электрычных, малярных і іншых работ.

«На расцэнках на паслугі новаўвядзенне ніяк не паўплывае, для жыльцоў плюс заключаецца ў тым, што за домам замацаваны адзін чалавек, да якога можна звярнуцца з рознымі праблемамі», — адзначыў Уладзімір Хадарцэвіч.

АМАЛЬ ПАЛОВА МАЛАДЫХ БЕЛАРУСКІХ СЕМ'ЯЎ ЗАДАВОЛЕНЫ СВАІМІ ЖЫЛЛЁВЫМІ ЎМОВАМІ

У Беларусі 47,3 працэнта хатніх гаспадарак, якія складаюць людзі ва ўзросце да 31 года, задаволены сваімі жыллёвымі ўмовамі, 27,1 працэнта — хутчэй не задаволены, 25,6 працэнта — зусім не задаволены. Аб гэтым сведчаць звесткі выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, праведзенага ў маі гэтага года з мэтай вывучэння ўмоў жыцця, паведамілі карэспандэнту БелТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Сярод гаспадарак, якія не задаволены жыллёвымі ўмовамі, 63,3 працэнта плануюць пабудаваць, купіць або абмяняць жылое памяшканне.

У Белстаце адзначылі, што характарыстыкі жыллёвых умоў з'яўляюцца важнейшымі індыкатарамі якасці жыцця хатніх гаспадарак. Удзельная вага гаспадарак, якія складаюць людзі ва ўзросце да 31 года, з памерам агульнай плошчы жылля на аднаго чалавека на пачатак гэтага года была наступнай: да 12 кв.м — 22,4 працэнта, 12,1-15 кв.м — 12,7 працэнта, 15,1-17 кв.м — 9,8 працэнта, 17,1-20 кв.м — 13,1 працэнта, 20,1-30 кв.м — 20,1 працэнта, 30,1 кв.м і вышэй — 21,9 працэнта.

БЕЛАРУСЬ ЗАЙМАЕ 4 МЕСЦА Ў СВЕЦЕ ПА КОЛЬКАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Беларусь займае чацвёртае месца ў свеце па колькасці людзей, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслявузаўскую адукацыю, на 10 тыс. жыхароў. Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БелТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Беларусь па колькасці людзей, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслявузаўскую адукацыю, на 10 тыс. чалавек насельніцтва (621 чалавек) займае адно з самых высокіх месцаў у свеце, уступаючы толькі Рэспубліцы Карэя (686), ЗША (667) і Расіі (660). У Белстаце адзначылі, што з году ў год павышаецца адукацыйны ўзровень беларускай моладзі. На 1000 маладых грамадзян цяпер прыпадае 169 чалавек з вышэйшай адукацыяй і 245 — з сярэдняй спецыяльнай. Значная частка моладзі — навучэнцы і студэнты. Трэба адзначыць, што моладзь прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны. На 1 студзеня гэтага года ў рэспубліцы функцыянавала 248 моладзевых грамадскіх аб'яднанняў.

ЗДАРЭННЕ БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

Здарэнне на чыгуначнай станцыі «Мінск-Сартавальны» не нанесла ўрону людзям і экалогіі. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведаміў галоўны рэвізор па бяспецы руху Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі Уладзімір Шаўчэнка, каментуючы паведамленне аб тым, што вечарам 4 жніўня на чыгуначнай станцыі «Мінск-Сартавальны» сышлі з рэек парожнія цыстэрны з-паз газу.

«Герметычнасць рухомага саставу не парушана, уцечкі шкодных рэчываў не дапушчана. У сувязі з гэтым ніякіх пагроз для навакольнага асяроддзя і людзей створана не было», — адзначыў Уладзімір Шаўчэнка. Галоўны рэвізор звярнуў увагу на тое, што пасля сыходжання з рэек сур'ёзных пашкоджанняў вагонаў не зафіксавана. Гэта адбылося ў выніку насоўвання кола на рэйкі. «Цяпер спецыялісты высвятляюць, чаму гэта здарылася, вядзецца расследаванне», — канстатаваў Уладзімір Шаўчэнка.

Паводле яго інфармацыі, на месцы здарэння чыгуначнае палатно пашкоджана не было, цяпер рух цягнікоў ажыццяўляецца ў штатным рэжыме згодна з раскладам.

І ЗНОЎ «ВУГАЛЬНЫЯ» ЦЫГАРЭТЫ

Днямі беларускія мытнікі двойчы спынілі спробу вывезці за мяжу кантрабандныя партыі цыгарэт.

Упачатку ў паўвагоне з каменным вугалем (цягнік ішоў з Расійскай Федэрацыі ў Латвію) знайшлі 4 тысячы пачкаў цыгарэт «NZ GOLD», зробленыя ў Беларусі. Тытунёвыя вырабы агульным коштам 24,4 мільёна рублёў канфіскавалі.

Як паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай работы Віцебскай мытні, на наступны дзень такім жа чынам і таксама ў цягніку, які ішоў у тым жа напрамку, знайшлі цыгарэты трох марак — 9 тысяч пачкаў агульным коштам 54,6 мільёна рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.